## ЯКАЯ ГАСПАДЫНЯ, ТАКІ І ПАРАДАК

Прачытайце прыказку. Пра каго так гавораць?

- Які майстар, такая і работа.

Галасі́ць — моцна крычаць.
Гвалт — крык, шум.
Засме́чана — *рус.*: замусорено, грязное.
Турбо́та — клопат.

Паслухайце твор. Пра якога персанажа з твора можна сказаць так, як у прыказцы?

### Варона і рак

Ляціць варона па-над ракой і каркае, ды так каркае, што не ўцярпеў рак сядзець у сваёй норцы і вылез паўзірацца, чаго яна галосіць. Вылез рак і пытае ў вароны:

— Чаго ты гэткі гвалт падняла?

— Чаго я гвалт падняла? Кожны будзе крычаць на маім месцы: гняздо, у якім я вясну веснавала і лета летавала, цяпер цалкам усё засмечана.

— А куды ж ты цяпер ляціш? — пытае рак.

— Новае гняздо шукаць!

Падумаў-падумаў рак дый кажа:

— Э, кумка, дарэмная твая турбота, бо ты ж і новае гняздо засмеціш...

*Паводле Вацлава Ластоўскага.*

1. Пра што пытаўся рак у вароны?
2. Чым варона была так незадаволена? Прачытайце.
3. Што адказаў рак вароне? Знайдзіце і прачытайце. Як вы зразумелі словы ра́ка?
4. Выберыце з прапанаваных слоў тыя, якімі можна назваць варону: *гаспадарлівая, старанная, лянівая, клапатлівая, неакуратная, неахайная*.
5. Што можна параіць вароне?
6. Размяркуйце ролі і прачытайце твор выразна.

Прачытайце заклічку. Вывучыце яе на памяць.

Лянота, лянота,
Ідзі ў балота,
У лесе схавайся,
Да нас не чапляйся.

*Галіна Багданава.*

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

**1.** Як называўся раздзел? Назавіце творы, у якіх мы даведаліся:

1) пра хлопчыка, які марыў стаць лётчыкам;
2) таго, хто першым пачынае новы дзень;
3) таго, каго можна назваць самым добрым;
4) пра Юрку і Змітрака.

**2.** З якіх твораў узяты наступныя радкі?

«— А які самы лепшы малюнак?
— Той, які ты не намаляваў, — адказаў бацька».

«— Э, кумка, дарэмная твая турбота, бо ты ж і новае гняздо засмеціш...»

**3.** Раскажыце заклічку пра ляноту.